# Тэхнічнае нармаванне і стандартызацыя

З мэтай ажыццяўлення работ у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі і стварэння ўмоў для ўдзелу ў працэсе стандартызацыі ўсіх зацікаўленых суб'ектаў тэхнічнага нармавання і стандартызацыі створаны і функцыянуюць два нацыянальных тэхнічных камітэта (далей-ТК):

ТК BY 27 «Электрасувязь», створаны на базе адкрытага акцыянернага аб'яднання «Гіпрасувязь»;

ТК BY 38 «Лічбавая трансфармацыя» на базе навукова-інжынернага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут прыкладных праграмных сістэм».

Вобласць дзейнасці ТК накіравана на распрацоўку тэхнічных нарматыўных прававых актаў (далей-ТНПА) у сферы электрасувязі і лічбавай трансфармацыі.

Галаўной арганізацыяй па стандартызацыі ў сістэме Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ААТ «Гіпрасувязь», якая выконвае наступныя функцыі:

- распрацоўка асноўных напрамкаў, праграм і планаў стандартызацыі і забеспячэнне іх рэалізацыі;
- арганізацыя распрацоўкі і перагляду дзяржаўных і галіновых тэхнічных нарматыўных прававых актаў (ТНПА) у галіне сувязі і інфарматызацыі;
- правядзенне экспертызы праектаў ТНПА на іх адпаведнасць сучасным патрабаванням;
- арганізацыя ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь, з міжнароднымі органамі па стандартызацыі;
- фарміраванне і вядзенне фонду міжнародных, міждзяржаўных, дзяржаўных і галіновых ТНПА і іншых нарматыўных дакументаў, якія забяспечваюць распрацоўку, праектаванне і эксплуатацыю сродкаў сувязі;
- даведачна-інфармацыйнае абслугоўванне арганізацый сувязі па пытаннях стандартызацыі;
- забеспячэнне зацікаўленых прадпрыемстваў галіновымі ТНПА і іншымі дакументамі па электрасувязі.

**Тэхнічныя кодэксы ўсталяванай практыкі (далей – ТКП) распрацаваныя ААТ «Гіпрасувязь»**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ТКП 018-2005 (02140) | Парадак правядзення аварыйна-аднаўленчых работ на валаконна-аптычных лініях сувязі | 2006-03-01 | Адкрыць |
| ТКП 033-2006 (02140) | Правілы правядзення работ па метралагічным забеспячэнні сістэм пачасовага ўліку злучэнняў | 2007-03-01 | Адкрыць |
| ТКП 173-2017 (33160) | Правілы тэхнічнай эксплуатацыі радыётэлевізійных перадаючых станцый | 2018-02-01 | Адкрыць |
| ТКП 179-2009 (02140) | Правілы пабудовы сетак электрасувязі | 2009-07-01 | Адкрыць |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ТКП 191-2009 (02140) | Правілы тэхнічнай эксплуатацыі наземных сродкаў спадарожнікавага лічбавага тэлевізійнага і гукавога вяшчання | 2009-10-01 | Адкрыць |
| ТКП 206-2009 (02140) | Правілы тэхнічнай эксплуатацыі лінейна-кабельных збудаванняў абаненцкіх ліній мясцовых тэлефонных сетак | 2010-02-25 | Адкрыць |
| ТКП 209-2009 (02140) | Маланкаахова аб'ектаў радыёсувязі. Правілы праектавання | 2010-02-25 | Адкрыць |
| ТКП 210-2017 (33160) | Электраўстаноўкі абсталявання электрасувязі. Правілы праектавання | 2018-02-01 | Адкрыць |
| ТКП 211-2010 (02140) | Лінейныя збудаванні электрасувязі. Правілы праектавання | 2010-04-01 | Адкрыць |
| ТКП 212-2010 (02140) | Правілы правядзення вымярэнняў валаконна-аптычных ліній сувязі, магістральных, унутрызонавых і мясцовых сетак электрасувязі | 2010-06-07 | Адкрыць |
| ТКП 213-2010 (02140) | Сеткі сотавай рухомай электрасувязі агульнага карыстання. Правілы праектавання | 2010-06-07 | Адкрыць |
| ТКП 214-2010 (02140) | Пошукавыя работы для праектавання лінейных збудаванняў гарадскіх тэлефонных сетак. Правілы правядзення | 2010-04-01 | Адкрыць |
| ТКП 215-2010 (02140) | Правілы пастраення мясцовых тэлефонных сетак на аснове камбінаваных вузлоў з агульнаканальнай сістэмай сігналізацыі №7 з улікам пропуску трафіка сеткі Інтэрнэт | 2010-04-01 | Адкрыць |
| ТКП 216-2016 (33160) | Гарадскія і сельскія сеткі электрасувязі. Правілы праектавання | 2017-02-01 | Адкрыць |
| ТКП 217-2017 (33160) | Радыётэлевізійныя станцыі перадачы. Правілы праектавання | 2018-02-01 | Адкрыць |
| ТКП 218-2010 (02140) | Лінейна-апаратныя цэхі вузлоў электрасувязі. Правілы праектавання | 2010-08-15 | Адкрыць |
| ТКП 219-2014 (02140) | Правілы арганізацыі тэхнічнай эксплуатацыі першасных сетак электрасувязі Рэспублікі Беларусь | 2015-03-01 | Адкрыць |
| ТКП 222-2010 (02140) | Радыёрэлейныя лініі перадачы прамой бачнасці. Правілы праектавання | 2010-08-15 | Адкрыць |
| ТКП 223-2020 (33160) | Парадак арганізацыі цэнтраў абслугоўвання выклікаў з выкарыстаннем тыпавых тэхналогій | 2020-04-01 | Адкрыць |
| ТКП 257-2010 (02140) | Сеткі размеркавальныя сістэм кабельнага тэлебачання. Правілы праектавання | 2010-11-01 | Адкрыць |
| ТКП 300-2011 (02140) | Пасіўныя аптычныя сеткі. Правілы праектавання і мантажу | 2011-05-05 | Адкрыць |
| ТКП 301-2011 (02140) | Правілы тэхнічнай эксплуатацыі пасіўных аптычных сетак | 2011-05-05 | Адкрыць |
| ТКП 305-2011 (02140) | Правілы тэхнічнай эксплуатацыі сеткі размеркавання праграм тэлебачання і радыёвяшчання | 2011-06-01 | Адкрыць |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ТКП 453-2012 (02140) | Правілы тэхнічнай эксплуатацыі электраўстановак прадпрыемстваў электрасувязі | 2013-02-01 | Адкрыць |
| ТКП 530-2014 (02140) | Парадак распрацоўкі і пастаноўкі на вытворчасць сродкаў сувязі | 2014-09-01 | Адкрыць |
| ТКП 588-2016 (33160) | Сродкі электрасувязі інтэлектуальных будынкаў, якія ўключаюць тыпавыя праектныя рашэнні сістэмы "Разумны дом". Правілы праектавання і прылады | 2016-12-15 | |

**ТК BY 38 «Лічбавая трансфармацыя», створаны на базе РУП "Цэнтр лічбавага развіцця" выконвае наступныя асноўныя функцыі:**

- распрацоўка асноўных напрамкаў, праграм і планаў стандартызацыі і забеспячэнне іх рэалізацыі;
- разгляд прапаноў ад суб'ектаў тэхнічнага нармавання і стандартызацыі па распрацоўцы стандартаў;
- падрыхтоўка прапаноў па распрацоўцы, унясенні змяненняў, перагляду і адмены стандартаў і іншых ТНПА;
- праверка дзеючых у Рэспубліцы Беларусь і замацаваных за дадзеным ПК стандартаў у сферы лічбавай трансфармацыі (далей – праверка стандартаў);
- садзейнічанне прымяненню міжнародных (рэгіянальных) стандартаў у эканоміцы краіны і гарманізацыя дзяржаўных стандартаў Рэспублікі Беларусь з міжнароднымі (рэгіянальнымі) стандартамі і нацыянальнымі стандартамі іншых краін;
- падрыхтоўка прапаноў па ўвядзенні міждзяржаўных стандартаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і адмене дзеючых дзяржаўных стандартаў;
- падрыхтоўка аналітычных матэрыялаў аб стане стандартызацыі ў галіне дзейнасці ТК;
- супрацоўніцтва з тэхнічнымі камітэтамі па стандартызацыі іншых аб'ектаў стандартызацыі;
- удзел у рабоце тэхнічных камітэтаў па стандартызацыі міжнародных і рэгіянальных арганізацый па стандартызацыі;
- удзел у працы канферэнцый, семінараў, якія праводзяцца міжнароднымі органамі і арганізацыямі па стандартызацыі;
- арганізоўвае семінары і нарады па стандартызацыі па замацаванай вобласці дзейнасці ТК і прымае ўдзел у іх правядзенні, а таксама публікацыю навукова-тэхнічных дакладаў і іншых інфармацыйных матэрыялаў па замацаванай вобласці дзейнасці ТК;
- аказвае навукова-тэхнічную дапамогу арганізацыям, якія прымяняюць распрацаваныя ТК стандарты і іншыя ТНПА, і кансультацыйныя паслугі па замацаванай вобласці дзейнасці ТК.

**Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты (дзяржаўныя стандарты), распрацаваныя ТК BY 38 «Лічбавая трансфармацыя»**

**СТБ 2583-2020 «Лічбавая трансфармацыя. Тэрміны і азначэнні».** Уведзены ў дзеянне з 1 сакавіка 2021 г. пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 8 снежня 2020 г. № 95.

**СТБ ISO 8000-2-2020 «Якасць дадзеных. Слоўнік».** Уводзіцца ў дзеянне з 1 красавіка 2021 г. пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 3 верасня 2020 г. № 48.

Спасылка на сайт Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь: https://tnpa.by.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/tekhnichnae-narmavanne-i-standartyzacyya*